# БЕЛАРУСКІЯ ТАВАРЫСТВЫ ДАПАМОГІ ПАЦЯРПЕЛЫМ АД ВАЙНЫ: ГІСТОРЫКА-АРХІЎНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ

**В. У. Долатава**

Нягледзячы на даволі паспяховае развіццё беларускай гістарычнай навукі ў апошнія дзесяцігоддзі, на сённяшні дзень яшчэ застаецца шмат малараспрацаваных пытанняў. Да ліку такіх можна аднесці і пытанні, звязаныя з дзейнасцю беларускіх таварыстваў дапамогі пацярпелым ад вайны ў гады Першай сусветнай вайны ў Вільні, Мінску, Петраградзе і вялікіх расійскіх гарадах, а таксама ў 1919-1925 гг. у Варшаве, Вільні, Гродна і іншых гарадах на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

У 1920-х гг. пра дзейнасць таварыстваў у Вільні, Мінску і Петраградзе ў сваіх працах пісалітакія вядомыя даследчыкі, як М. Доўнар-Запольскі, У. Ігнатоўскі, Ф. Турук. Але ў пазнейшы час таварыствы былі выкрэслены з гістарыяграфіі амаль на пяцьдзесят год. У 1980-я гг. В. Скалабан вярнуў забытую тэму ў гісторыю Беларусі, прысвяціўшы свае навуковыя артыкулы Віленскаму і Петраградскаму таварыствам, Мінскаму аддзелу Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны ў Вільні. Але на сённяшні дзень не існуе абагульняючай працы, прысвечанай усебаковаму разгляду дзейнасці таварыстваў. Недахоп фактычных звестак у гістарыяграфіі не дае магчымасці даследчыкам аб’ектыўна выказвацца аб ролі гэтых арганізацый у гісторыі нашага народа. Таму ў межах дадзенага артыкула мэтазгодна прывесці новыя фактычныя звесткі аб таварыствах, выяўленыя ў дакументах фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны ў Вільні было ўнесена ў рэестр грамадскіх арганізацый па Віленскай губерніі ў красавіку 1915 г. [1, с. 3].13 мая 1915 г. на першым паседжанні камітэта таварыства былі выбраны маршалак таварыства В. Іваноўскі і яго намеснікі А. Луцкевіч і В. Ластоўскі [2, с. 3]. У хуткім часе пачынаецца праца па арганізацыі дабрачынных мерапрыемстваў дзеля дапамогі беларусам ва ўмовах ваенных дзеянняў, адкрываюцца аддзелы таварыства. А. Луцкевіч у адным з лістоў да нямецкіх улад адзначаў, што таварыства ўлетку 1915 г. паспяхова заснавала ў беларускіх гарадах некалькі дзясяткаў аддзелаў, але з прычыны недахопу фінансавых сродкаў большасць з іх былі закрыты [3, арк. 11]. Дакладна вядома пра сем аддзелаў таварыства ў Мінску, Дзісне, Вілейцы, Празароках,

Друскеніках, в. Гожа Гродзенскай губерніі, Полацку, якія існавалі ў 1915–1917 гг. [4, с. 3].

25 сакавіка 1916 г. таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны было адкрыта ў Дзвінску (сённяшні Даўгаўпілс) [5]. Па шэрагу прыкмет дадзеная арганізацыя таксама з'яўлялася аддзелам Віленскага таварыства. Мэтазгодным з'яўляецца далейшы пошук сведчанняў аб дзейнасці аддзелаў Віленскага таварыства ва ўсіх гарадах і мястэчках, дзе пасля Лютаўскай рэвалюцыі былі заснаваны Беларускія нацыянальныя камітэты (напрыклад, на Магілёўшчыне).

У ліпені 1915 г. быў утвораны Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. На снежань 1916 г. ён налічваў каля пяцідзесяці членаў, у тым ліку В. Чавусава, А. Лявіцкага, У. Галубка, В. Астрамовіча, В. Лявіцкую, Л. Сівіцкую, М. Багдановіча, С. Плаўніка, А. Смоліча, А. Уласава [6, с. 381]. У 1915–1917 гг. Мінскі аддзел з'яўляўся адным з буйных цэнтраў беларускага нацыянальнага руху на занятай царскімі войскамі тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю.

У 1916–1918 гг. Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны паспяхова дзейнічала ў Петраградзе. Цікавасць прадстаўляюць дакументы, прысвечаныя яму, якія захоўваюцца ў НАРБ (Фонд 672, спр. 1–9). Актыўныя члены таварыства Б. Эпімах-Шыпіла, А. Ярэміч, Э. Будзька, Я. Варонка, А. Чарвякоў, З. Жылуновіч шмат намаганняў прыклалі, каб дапамагчы беларускай вучнёўскай моладзі ў Петраградзе, адкрыць для іх інтэрнаты, школы, набыць падручнікі, аплаціць вучэбныя курсы [7, арк. 11–17].

Пасля акупацыі Вільні ў верасні 1915 г. ў Беларускім таварыстве дапамогі пацярпелым ад вайны распачалі актыўную дзейнасць А. і І. Луцкевічы, А. Пашкевіч, Ю. Мэнке, В. Ластоўскі і іншыя вядомыя беларускія нацыянальныя дзеячы. З дакументаў школьнай камісіі, утворанай дзеячамі пры таварыстве, становіцца зразумела, што менавіта на сродкі таварыства пачынаецца развіццё школьніцтва на Віленшчыне, Ковеншчыне і Гродзеншчыне ў гады Першай сусветнай вайны, а таксама праца настаўніцкіх курсаў [8].

У БДАМЛМ захоўваюцца шматлікія дакументы аб палітычнай дзейнасці Віленскага таварыства ў 1916–1918 гг. Напрыклад, мемарандум, прадстаўлены беларускімі дэлегатамі (актыўнымі членамі таварыства) на міжнароднай канферэнцыі ў Лазане ў 1916 г. (Фонд 3. Воп. 1. Спр. 193. Арк. 59–60), або дакументы студзеньскай беларускай канферэнцыі 1918 г. (Фонд 3. Воп. 1. Спр. 140, Арк. 74–75). Справы з асабістымі і службовымі дакументамі дзеячаў таварыства В. Ластоўскага

(Фонд 3. Воп. 1. Спр. 256), К. Дуж-Душэўскага (Фонд 3. Воп. 1. Спр. 244), Б. Тарашкевіча (Фонд 3. Воп. 1. Спр. 225-227), Л. Дубейкоўскага (Фонд 3. Воп. 1. Спр. 235-238), А. і І. Луцкевічаў (Фонд 3. Воп. 1. Спр. 261–262) змяшчаюць шмат удакладняючых дадзеных аб дзейнасці таварыства ў Вільні. Менавіта вышэй узгаданыя справы беларускіх дзеячаў змяшчаюць звесткі аб Віленскім, Варшаўскім і Гродзенскім таварыствах, якія распачалі сваю дзейнасць у 1919 г. ужо ў іншых палітычных абставінах.

Кіраўнік Варшаўскага таварыства Л. Дубейкоўскі курыраваў працу Гродзенскага аддзела таварыства і, адкрытых у Гродна, беларускай гімназіі (дырэктар П. Тамашчык) і прытулка (загадчыца С. Буйло) [9, арк. 29]. Членамі таварыства ў Варшаве былі такія вядомыя дзеячы, як В. Друцкі-Падбярэзскі, А. Більдзюкевіч, Э. Ястжэбска, С. Буйло, Г. Леўковіч, А. Трэпка, А. Уласаў, Р. Зямкевіч, Я. Ладноў, М. Рамановіч, А. Смоліч, В. Іваноўскі, Ф. Кушаль, П. Жаўрыд, У. Сталыгва. У 1919 г. П. Жаўрыду было даручана адкрыць аддзел таварыства ў Слоніме [10, арк. 37].

Дакументы паседжанняў Віленскага таварыства ў 1923 і 1925 гг. сведчаць пра тое, што да таго часу дзейнасць таварыства звузілася да ўтрымання некалькіх школ і прытулкаў на Віленшчыне (членамі таварыства з'яўляліся Р. Астроўскі, С. Рак-Міхайлоўскі, Э. Будзька і інш.) [11, арк. 15, 23].

Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны пытанне аб беларускіх бежанцах заставалася нявырашаным амаль да сярэдзіны 1920-х гг. Вастрыня бежанскага пытання прымушала беларускіх дзеячаў абмяркоўваць гэтыя праблемы зноў і зноў у 1919–1921 гг. на нарадах у Празе, Берліне, Жэневе. У секцыю дапамогі ахвярам вайны і галадаючым уваходзілі прадстаўнікі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны, Беларускага грамадскага камітэта дапамогі галадаючым на Беларусі [12, с. 1226–1227]. Неаднаразова дзеячы БНР звярталіся да еўрапейскіх дзяржаў з заклікамі дапамагчы беларускім бежанцам вярнуцца на Радзіму.

Першая сусветная вайна выступае асаблівым супярэчлівым этапам у развіцці беларускага нацыянальнага руху. І цэнтрамі гэтага руху падчас вайны з'яўляліся менавіта беларускія таварыствы дапамогі пацярпелым ад вайны – адзіныя легальныя нацыянальныя арганізацыі беларусаў. Дзейнасць жа Варшаўскага і Віленскага таварыстваў пасля гэтай вайны была не менш патрэбнай для беларусаў, чым у папярэдні перыяд. Таварыствы аб'ядноўвалі ў сваім складзе розных па сваіх поглядах

беларускіх нацыянальных дзеячаў. Яны мелі магчымасць падтрымліваць сувязі паміж сабой, мусілі разам праводзіць дабрачынную, нацыянальна-выхаваўчую, культурна-асветніцкую і палітычную беларускую працу і на беларускіх землях, і ў вялікіх расійскіх гарадах. Праз працу ў беларускіх таварыствах нацыянальныя дзеячы дапамаглі свайму народу і дасягнулі сваіх палітычных мэт.

**Літаратура**


1. Статут Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны.Вільня: Друкарня Кухты, 1915.
2. Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны //Наша ніва. 1915 г.22 мая. № 19–20.
3. БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 131. Перапіска Беларускага камітэта ў г. Вільня з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі па арганізацыйных пытаннях 1915–1916 гг.
4. З Беларусі і Літвы // Наша ніва. 1915. 2 ліпеня.
5. НГАБ. Фонд 2649. Воп. 1. Спр. 698.Паведамленне губернскага прысуцтва дзвінскаму паліцмайстру аб бесперашкодным адкрыцці «Дзвінскага камітэта пааказанню дапамогі бежанцам» 25 сакавіка 1916 г.
6. Багдановіч М.А. Агляд працы за першы год Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны / М.А. Багдановіч // Выбраныя творы. Мінск: Беларускі кнігазбор, 1996.С. 381–383.
7. НАРБ. Фонд 672. Воп. 1. Спр. 2. Анкеты бежанцаў аб аказанні дапамогі, фінансавыя дакументы кампаній, крам, складаў і асабовых твараў Петраграда за паслугі і тавары, аказаныя таварыству (рахункі, квітанцыі, распіскі і інш.) 8.02.-23.12.1916 г.
8. БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 124. Дакументы школьнай камісіі Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (пратаколы, спісы настаўнікаў, расклад лекцый, праграмы, пасведчанні і інш.) 1913–1916 гг.
9. БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1.Спр. 237. Дакументы службовай дзейнасці Л.І. Дубейкоўскага (пратаколы Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, дакументы аб дзейнасці беларускіх школ і прытулкаў і інш.) 1919–1921, 1928 гг.
10. БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 247. Дакументы П.Я. Жаўрыда (асабістыя, перапіска) 1899-1923 гг.
11. БДАМЛМ. Фонд 3. Воп. 1. Спр. 130. Пратаколы паседжанняў прэзідыума Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны 1918, 1923–1925 гг.
12. Рэзалюцыі, прынятыя на Беларускай Нацыянальна-Палітычнай нарадзе ў Празе // Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: Фонд № 582 Дзяржаўнага Архіву Літвы (“Рада міністраў БНР”). Т. 1. Кн. 2. Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага, 1998. С. 1220–1227.